# З ПРАМОВЫ таварыша БЫЛІНСКАГА

**(Старшыня Совета Народных Комісараў Беларускай ССР)**

Ніколі за ўсю сваю нацыянальную гісторыю беларускі народ не падвяргаўся такой небяспецы. Крывёю заліта беларуская зямля. Разбой і грабяжы, забойствы і гнусную надругу, прыгонную кабалу і рабства прынеслі фашысцкія варвары беларускаму народу.

У сталіцы Беларусі фашысцкія каты расстралялі і замучылі тысячы мірных жыхароў. Жорсткую расправу над мірным насельніцтвам гітлераўцы прадаўжаюць і па сёнешні дзень. Зусім нядаўна ў Суражскім раёне немцы спалілі 2.321 дом калгаснікаў, некалькі вёсак спалена разам з жыхарамі—дзецьмі і жанчынамі. У Окцябрскім, Клічаўскім раёнах Беларусі фашысцкія мярзотнікі таксама спалілі больш двух дзесяткаў вёсак разам з жыхарамі. Яны не пашкадавалі ні дзяцей, ні жанчын, ні старыкоў.

Больш 700 тысяч дзяцей, жанчын і мужчын фізічна знішчылі немцы ў Беларусі.

Слаўная сталіца Беларусі —Мінск і гарады Гомель, Віцебск, Магілёў, Орша, Гродна і многія іншыя ператвораны немцамі ў руіны. Там, дзе раней каласіліся багатыя калгасныя нівы,— зараз спустошаная чужаземцамі зямля. Частку нашага народа немцы фізічна знішчылі, прадаўжаюць знішчаць, а частка адпраў-

...ным днём. Множацца рады грозных народных мсціўцаў. Яны помсцяць чужаземным захопнікам за пакуты, за кроў і слёзы савецкіх людзей. Смерць нямецкім акупантам! — вось агульнанародны лозунг.

І на фронце, і ў тылу беларусы, не шкадуючы сіл, ні самога жыцця, робяць усё, каб паскорыць дзень вызвалення сваіх братоў і сясцёр ад нямецка-фашысцкай няволі.

Беларускі народ даў клятву вялікаму правадыру, роднаму бацьку нашаму, палкаводцу таварышу Сталіну —не выпускаць зброі з сваіх рук да таго часу, пакуль хоць адзін фашысцкі гад будзе паганіць родную зямлю.

Беларускі народ ганарыцца сваімі слаўнымі сынамі, якіх Совецкі ўрад удастоіў вышэйшага звання Героя Совецкага Саюза. Імёны— Гастэла, Даватара, Талаліхіна, Смалячкова, Антоненкі, Палаўчэні, Піччука, Каўшарава, партызан Бумажкова, Паўлоўскага, Сільніцкага, Казлова, Курыленкі і іншых навекі ўвойдуць у гісторыю барацьбы народа за яго чэсць і нацыянальную незалежнасць. Сотні і тысячы сыноў Беларусі ўдастоіліся ўрадавых узнагарод. Яны змагаюцца ў радах нашай гераічнай Чырвонай Арміі на фронце і ў партызанскіх атрадах у ты-

Таварышы беларусы, набліжаецца знамянальная гадавіна — 25-годдзе Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. З гэтай датай звязаны лёс беларускага народа. Вялікія Ленін і Сталін з'яўляюцца тварцамі Совецкай Беларусі. Пры дапамозе брацкага рускага народа Беларусь за годы Совецкай улады вырасла ў самастойную нацыянальную дзяржаву з багатай прамысловасцю, передавой сельскай гаспадаркай і высокаразвітай нацыянальнай культурай і мастацтвам. Сваім вераломным нападам у чэрвені 1941 года нямецкія разбойнікі спынілі творчую работу беларускага народа.

Дарагія нашы браты і сёстры роднай Беларусі! Не шкадуючы сіл і жыцця свайго, будзем са зброяй у руках вызваляць наш край, будзем біць немцаў да апошняга. Усе на смертны бой з заклятым ненавісным ворагам! Яшчэ мацней біце і бязлітасна знішчайце фашысцкіх гадаў усюды: у вёсцы і ў горадзе, у лесе і ў полі. Не давайце ворагу спакою ні ўдзень, ні ўночы. Шырэй партызанскія рады! Усяляк дапамагайце партызанам. За нашу справядлівую справу стойце смела. Мацней біце немца-сатану. Ударыш у Беларусі—адгукнецца на Дану. Кожны спушчаны пад адкос поезд— гэта ўдар па немцу пад Сталінградам і на Каўказе...

З поуным тэкстам дакумента можна азнаеміцца у бібліятэцы